

# Уладзімір АНЦУЛЕВІЧ

**40 год, беларус, кандыдат фізіка-матэматычных навук, выкладчык інфарматыкі гімназіі №199**

Нарадзіўся ў Гродзенскім раёне ў сям'і сялян. Скончыў фізічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Працаваў у Інстытуце фізікі АН Беларусі стажорам-даследчыкам, малодшым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам сектара, вядучым канструктарам СКТБ, навуковым супрацоўнікам, старшым навуковым супрацоўнікам. Завочна скончыў аспірантуру, абараніў дысертацыю. Мае каля 70 навуковых работ. Апошнія два гады працуе выкладчыкам у гімназіі і працягвае працаваць старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута фізікі на грамадскіх пачатках (без зарплаты). Жанаты, выхоўвае сыноў 12 і 18 гадоў. Жыве з бацькамі жонкі на тэрыторыі Нававіленскай выбарчай акругі.

Ул.Анцулевіч — вядомы на Беларусі і за яе межамі палітык. У прыватнасці, пад яго кіраўніцтвам у 1992 годзе было сабрана звыш 440 тысяч подпісаў за рэферэндум па пытанню аб роспуску Вярхоўнага Савета. Ён з'яўляецца каардынатарам блоку дэмакратычных партыяў — адзінага блоку на цяперашніх выбарах.

---

***Паважаныя грамадзяне!***

***Для многіх з Вас прагаласаваць за прадстаўніка Беларускага Народнага Фронту — гэта акт грамадзянскай мужнасці. Аднак сёння ён неабходны. Я не адзін — мы ідзем на выбары камандай, якая мае дакладна распрацаваную праграму выхада з крызісу. Мы гатовы ўзяць на сябе адказнасць за будучае Беларусі. Ніякая іншая палітычная сіла, ніякі іншы «незалежны» кандыдат-адзіночка не можа гарантаваць выкананне сваіх абяцанняў.***

***Уладзімір АНЦУЛЕВІЧ***

**Старшыня ініцыятыўнай групы рэферэндума па пытанню аб роспуску Вярхоўнага Савета (незаконна забароненага Вярхоўным Саветам у 1992 годзе), Старшыня выбарчага Камітэта БНФ**

## Наш кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета

# Анцулевіч Уладзімір Іванавіч

**вылучаны жыхарамі нашай акругі і партыяй Беларускага Народнага Фронту**

**Паважаныя землякі!**

У 1990 годзе эканамічны стан нашай Рэспублікі і наша з вамі матэрыяльнае становішча былі не горшыя, а ў чымсці і лепшыя за нашых суседзяў. Але за пяць гадоў, што прайшлі з мінулых выбараў у Вярхоўны Савет, суседнія краіны правялі рашучыя эканамічныя рэформы, увялі стабільную нацыянальную валюту, спынілі рост цэнаў, рашуча ўмацавалі палітычную самастойнасць сваіх дзяржаў, забяспечылі сабе гарантыі ад уцягвання ў войны на абшарах былога СССР.

Мы ж згубілі гэтыя пяць гадоў на пустыя спрэчкі, ці трэба незалежнасць, нацыянальная валюта, рублёвая зона, і замест таго каб рухацца наперад, засталіся сядзець у «балоце ў цэнтры Еўропы».

**Паважаныя суграмадзяне!**

**14 мая пройдуць выбары ў Вярхоўны Савет.**

Або мы зноў павыбіраем старую наменклатуру і «независимых» балбатуноў-абяцальнікаў — і застанемся таптацца на месцы, або

**падтрымаем згуртаваную каманду прафесіяналаў, якія выведуць нашу дзяржаву да нармальнага жыцця.**